БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 1(476)(091)+141.30

**КЛІМОВІЧ**
**Ганна Ігараўна**

# РЭЦЭПЦЫЯ ІДЭЙ НЕАТАМІЗМУ Ў КАТАЛІЦКАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XX СТ.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне навуковай ступені
кандыдата філасофскіх навук
па спецыяльнасці 09.00.03 – гісторыя філасофіі

Мінск, 2016

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — **Шубара Вольга Ўладзіміраўна,**
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,
дацэнт кафедры філасофіі культуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: — **Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч**,
доктар гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі славянскіх
народаў УА “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

**Нікуліна Юлія Ўладзіміраўна**,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,
дацэнт кафедры дзяржаўнага будаўніцтва
і кіравання Акадэміі кіравання
пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

Апаніруючая арганізацыя — **УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”**

Абарона адбудзецца 12 мая 2016 года ў 14.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.13 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030 г. Мінск, вул. Ленінградская 8, аўдыторыя 407, тэл. 226-55-41.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы “ 8 “ красавіка 2016 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — А. А. Лягчылін

# УВОДЗІНЫ

Беларуская думка XX ст. – шматвектарны феномен, абумоўлены прысутнасцю на дадзенай геакультурнай прасторы шматлікіх філасофскіх плыняў, вымушаных існаваць і развівацца разам у перманентным напружаным ўзаемадзеянні.

У гэты насычаны гістарычнымі падзеямі перыяд вылучаецца кола беларускіх мысліцеляў, якія абапіраліся ў рэфлексіі на праграмныя ўстаноўкі неатамізму. Вышэйпазначаная характарыстыка была актуальнай для групы аўтараў, якія належалі да беларускай рэлігійна-філасофскай плыні каталіцкага напрамку. Ён прадстаўлены вялікім корпусам тэкстаў Ф. Абрантовіча (1884–1946), І. Бобіча (1890–1944), Л. Гарошкі (1911–1977), А. Надсана (1926–2015) (часткова), Т. Падзявы (1906–1975), Б. Пачопкі (1884–1940), Я. Рэшаця (1890–1958), А. Станкевіча (1891–1949), Ч. Сіповіча (1914–1981), Я. Тарасевіча (1892–1978), які дагэтуль не быў асэнсаваны ў дастатковай ступені ў айчыннай і замежнай гісторыі філасофіі.

У сувязі з пэўнымі гістарычнымі падзеямі кірунак рэлігійна-філасофскай традыцыі, да якога належалі згаданыя дзеячы, атрымаў маргінальны статус і, як вынік, быў на доўгі час выкраслены з гісторыі грамадска-філасофскай думкі Беларусі. Разам з тым рэфлексія названых аўтараў, дзе адлюстраваліся іх светапоглядныя арыенціры, з’яўляецца важнай крыніцай ведаў для вывучэння гісторыі філасофіі Беларусі.

Погляды вышэйпералічаных беларускіх мысліцеляў маюць несумненную актуальнасць. Памянёныя аўтары, як сведчаць крыніцы, з’яўляліся прыхільнікамі эвалюцыйнага шляху развіцця, рашуча адмаўляючы любыя метады рэвалюцыйнай барацьбы, таксама яны выступалі супраць уселякіх праяў нездаровага нацыяналізму, адзначаючы, што яго крайнія праявы – гэта хвароба эгаізму ў больш пашыраным выглядзе. У сённяшні неспакойны перыяд, калі свет узрушаны шматлікімі рэвалюцыйнымі падзеямі, тэндэнцыямі пашырэння папулярнасці ўльтраправых поглядаў, творчая спадчына дзеячаў, якія імкнуліся захаваць стабільнасць у грамадстве і выступалі за эвалюцыйны шлях развіцця, з’яўляецца надзвычай запатрабаванай.

Трэба адзначыць, што неатамізм будуе своеасаблівы мост паміж рэлігійным і навуковым тыпамі светапогляду, дапамагаючы ім знайсці дыялог. Нездарма да спадчыны дадзенай філасофскай плыні звяртаюцца знакамітыя вучоныя (напрыклад, фізікі І. Барбур, Д. Полкінхорн і інш.). Творчыя здабыткі беларускіх аўтараў могуць быць таксама запатрабаванымі і ў аспекце асэнсавання ўзаемаадносін і пошуку паразумення паміж філасофіяй і верай.

Праз творчасць беларускіх рэлігійных дзеячаў трансляваліся асноўныя ідэі і прынцыпы неатамізму, якія сталі падмуркам для далейшага станаўлення на іх базе спецыфічнай нацыянальнай ідэі. Але, чужыя агульнаму дыскурсу навуковых даследаванняў па гісторыі філасофіі ў часы існавання СССР, яны апынуліся па-за межамі інтарэсаў даследчыкаў. Удзел прадстаўнікоў рэлігійна-філасофскай плыні ў гісторыка-філасофскіх працэсах на Беларусі ў сувязі з пэўнымі гістарычнымі абставінамі ігнараваўся. Між тым работы дадзеных аўтараў з'яўляюцца важным унёскам у культурную спадчыну беларускай нацыі. Яны аказалі ўплыў на фарміраванне светапогляду пэўнай часткі беларусаў, іх пазітыўныя здабыткі могуць быць выкарыстаны ў працэсе фарміравання некаторых аспектаў беларускай нацыянальнай ідэі.

З усяго вышэйсказанага вынікае безумоўная важнасць і актуальнасць дадзенай тэмы як з пункту погляду практычнага выкарыстання, так і з пункту погляду асэнсавання агульных тэндэнцый гісторыка-філасофскіх працэсаў на беларускіх абшарах XX ст. Даследаванне асвятляе новую галіну рэлігійна-філасофскай думкі Беларусі і робіць значны ўнёсак у рэканструкцыю беларускай інтэлектуальнай сферы XX ст., што дазваляе зразумець яе як цэласны феномен і дакладней прасачыць дынаміку агульнага развіцця гісторыка-філасофскіх працэсаў на дадзенай тэрыторыі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры філасофіі культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў межах навуковай тэмы № 20120474 “Беларуская філасофская традыцыя ў еўрапейскім кантэксце” дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава”.

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта даследавання –** вызначыць спецыфіку рэцэпцыі ідэй неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі XX ст.

Рэалізацыя мэты прадугледжвае вырашэнне наступных **задач:**

– высветліць асноўныя шляхі пранікнення ідэй неатамізму на беларускія абшары;

– вызначыць асаблівасці развіцця беларускай рэлігійна-філасофскай думкі XX ст. ў карэляцыі з ідэямі неатамізму;

– акрэсліць асноўныя аспекты метафізікі быцця і пазнання неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі XX ст.;

– рэканструяваць антрапалагічныя ідэі неатамізму неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі XX ст.;

– прааналізаваць сацыяльную праблематыку неатамізму неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі XX ст.

**Аб'ект даследавання** – праграмныя ўстаноўкі каталіцкай думкі Беларусі XX ст.

**Прадмет даследавання** – змест і асноўныя асаблівасці рэцэпцыі ідэй неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі XX ст.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў навуковай літаратуры даследуецца ўплыў філасофіі неатамізму на творчую спадчыну беларускіх каталіцкіх мысліцеляў, адзначаецца яе асноватворны характар, а менавіта:

- вылучаны асноўныя шляхі адаптацыі плыні неатамізму ў праблемным полі філасофскай беларускай традыцыі;

- вызначана наяўнасць ідэй неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы XX ст.;

- выяўлены спецыфічны тып неатамістычных ідэй у каталіцкай думцы Беларусі XX ст.;

- эксплікаваны асаблівасці ўспрыняцця асноўных праграмных установак метафізікі быцця і пазнання дактрыны неатамізму ў творчасці беларускіх мысліцеляў каталіцкага накірунку;

- акрэслены спецыфічныя рысы працэсу рецэпцыі ідэй неатамізму ў антрапалагічным аспекце беларускай рэлігійна-філасофскай думцы каталіцкага накірунку;

- вызначана своеасаблівая фундаванасць ідэямі неатамізму сацыяльнага аспекту каталіцкай думкі Беларусі XX ст.

Высновы дысертацыі значна дапаўняюць і дазваляюць па-новаму асэнсаваць тыя гісторыка-філасофскія працэсы, якія мелі месца на беларускай геакультурнай прасторы XX ст. Упершыню ў вобласць даследавання патрапілі філасофскія здабыткі беларускіх каталіцкіх мысліцеляў, умацаваныя ідэямі неатамізму, якія аказалі ўплыў на іх палітычна-ідэалагічную і культурна-асветніцкую дзейнасць. На падставе атрыманых вынікаў могуць праводзіцца даследаванні жыццёвых і творчых шляхоў Ф. Абрантовіча, І. Бобіча, Л. Гарошкі, Т. Падзявы, Б. Пачопкі, Ч. Сіповіча, А. Станкевіча, Я. Тарасевіча, П. Татарыновіча і інш. Акрамя гэтага, прадстаўленыя высновы могуць стаць падмуркам шэрагу даследаванняў ў вабласцях гісторыі філасофіі, гісторыі Беларусі і рэлігіязнаўства.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Вылучаны асноўныя шляхі пранікнення ідэй неатамізму на беларускую геакультурную прастору. Першапачатковымі крыніцамі з'яўляліся папскія

энцыклікі, творчае пераасэнсаванне духоўнай спадчыны Фамы Аквінскага, знаёмства з творчасцю заходнееўрапейскіх аўтараў–неатамістаў. Шляхамі пранікнення былі: сістэма адукацыі, гамілетыка, сродкі масавай інфармацыі, навуковыя даследаванні, мастацкая літаратура і дзейнасць асветніцкіх таварыстваў.

2. Вызначана, што на пачатку XX ст. у беларускую рэлігійна-філасофскую думку пачалі пранікаць ідэі неатамізму. У акрэслены час рэлігійны кірунак займаў значнае месца ў сістэме беларускай філасофскай думкі адначасова з сацыял-дэмакратычным накірункам. У далейшым на ўсходняй частцы Беларусі адбылася змена ідэалагем, вынікам чаго было спыненне рэлігійнага напрамку філасофіі, у той час як на заходняй частцы, маючы падставай ідэі неатамізму і ў некаторых выпадках аўгусцініянства, ён працягваў існаваць і развівацца. Адзначаецца спецыфічнасць успрыняцця праграмных установак неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы. Гэта быў арыгінальны сінтэз ідэй арыстоцелеўскай і экзістэнцыяльнай версій неатамізму. Назіраецца асэнсаванне беларускімі аўтарамі іншых філасофскіх плыняў, якія знаходзіліся ў стане перманентнага дыялогу ці супрацьстаяння з неатамізмам.

3. Адзначана агульная падначаленасць метафізікі быцця і пазнання беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага напрамку неатамістычным ідэям. Разам з тым маецца шэраг асаблівасцяў, якія прымушаюць адрозніваць беларускі варыянт рэцэпцыі ад агульнаеўрапейскіх тэндэнцый, гэта спецыфічная сцыентызаванасць у галіне рэлігійных разважанняў, а таксама зварот да праблем, неактуальных для заходнееўрапейскага кірунку: дыскусіі вакол пытання акта крэацыянізму.

4. Паказана, што беларуская рэлігійна-філасофская думка ў антрапалагічным аспекце арыентавалася на ідэі неатамізму разам з адначасовым спецыфічным зваротам да неўласцівых неатамізму спірытуалістычных тэндэнцый. Адзначаецца арыгінальнае прачытанне ідэй Фамы Аквінскага, дзе першапачаткова духоўныя аспекты чалавека трансфармуюцца ў матэрыяльныя. Заўважана актыўнае выкарыстанне спрэчных для дагматыкі каталіцкага касцёла навуковых ідэй эвалюцыі да афіцыйнага дазволу Ватыкана.

5. Выяўлена, што, маючы падмуркам ідэі неатамізму ў сацыяльным аспекце, беларуская рэлігійна-філасофская думка выпрацавала ўласную сацыяльную праграму эвалюцыйнага шляху развіцця, заснаванага на прынцыпах “цывілізацыі любові” і салідарызму. Спецыфічнай з’яўляецца у дадзеным аспекце шматлікасць тэорый беларускіх аўтараў. Адзначаецца, што ў якасці падставы сацыяльнага развіцця знаходзіцца этычнае жыццё індывідуума.

**Асабісты ўклад даследчыка**

Пошук па тэме дысертацыі ажыццяўляўся цалкам самастойна, уяўляе сабой комплекснае гісторыка-філасофскае даследаванне, якое мае на мэце вызначэнне характару рэцэпцыі ідэй неатамізму ў беларускай філасофскай думцы XX ст. Пераклад крыніц на англійскай і польскай мове – аўтарскі.

У працы згодна з пастаўленымі задачамі даследавана, прааналізавана, сістэматызавана творчая спадчына беларускіх мысліцеляў неатамістычнай накіраванасці, якая да гэтага часу не знаходзіла належнага месца ў праблемным полі гісторыі філасофіі Беларусі. У даследаванні прадстаўлена тэарэтычная рэканструкцыя працэсаў рэцэпцыі асноўных аспектаў дактрыны неатамізму ў беларускай філасофскай думцы, здзейснены аналіз асноватворных канцэптаў беларускай рэлігійна-філасофскай думкі на працягу XX ст., выяўлена іх сувязь з праграмнымі ўстаноўкамі філасофіі неатамізму. Усе ключавыя высновы дысертацыі прадстаўлены ў асабіста зробленых публікацыях. Маецца акт аб выкарыстанні вынікаў дысертацыйнага даследавання ў вучэбным працэсе.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі даследавання былі прадстаўлены ў выглядзе выступленняў, дакладаў і тэзісаў на наступных канферэнцыях: 18 красавіка 2012 г. – 69-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта “Ідэі неатамізму ў рэлігійна-філасофскай думцы Беларусі”, 11 лістапада 2011 г. – міжнародная навуковая канферэнцыя “Доўгірдаўскія чытанні II” (Мінск, АН РБ), тэма даклада “Тамісцкая традыцыя ў творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў”; 24 лістапада 2011 г. – міжнародная навуковая канферэнцыя “Раманаўскія чытанні VIII” (Магілёў, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А. Куляшова), тэма даклада “Пытанне наяўнасці тамісцкай традыцыі ў беларускай інтэлектуальнай думцы”, 24–26 лістапада 2011 г. – міжнародная навуковая канферэнцыя “Этнасацыяльныя і канфесіянальныя працэсы ў сучасным грамадстве” (Гродна, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы), тэма даклада “Другі Ватыканскі Сабор: рэакцыя каталіцкіх інтэлектуалаў”; 26–27 красавіка 2012 г. – міжнародная навуковая канферэнцыя “Доўгірдаўскія чытанні III: філасофская антрапалогія і сацыяльная філасофія”, тэма даклада “Праблема асэнсавання дзяржаўнага будаўніцтва ў творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў”; 26 красавіка 2013 г. – "Гісторыка-філасофскія даследаванні ў рэгіёне Усходняй Еўропы: вопыт, задачы, сацыякультурная значнасць", тэма даклада “Рэцэпцыя ідэй неатамізму ў беларускай філасофскай думцы”; 11-13 кастрычніка, 2013 г. – Трэці Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі, тэма даклада “Роля беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў у фармаванні беларускай геакультурнай прасторы XX ст.”; IX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Рэлігія

і грамадства” 13 студзеня 2015 г., тэма даклада “Тэматызацыя праблемнага поля беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага напрамку пачатку XXI ст.”.

Вынікі даследавання выкарыстаны ў вучэбным працэсе, улічаны пры распрацоўцы курсаў “Філасофія”, “Гісторыя Беларусі”, “Параўнальнае рэлігіязнаўства”.

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 14 навуковых працах (4,8 аўт. арк.). З іх 7 артыкулаў у часопісах у згоднасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў ў Рэспубліцы Беларусь (агульным памерам 3,4 аўт. арк.); і 7 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый і тэзісаў дакладаў (1,4 аўт.арк.).

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура дысертацыі падпарадкавана логіцы вывучэння аб’екта даследавання, вырашэнню пастаўленых мэты і задач. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса. У межах главы 1 прадстаўлены аналітычны агляд літаратуры і метадалагічны апарат. Глава 2 прысвечана аналізу тэматычнага поля, асаблівасцям і ключавым момантам фарміравання беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў дадзены перыяд, а таксама маркіраванню асноўных філасофскіх напрамкаў, якія прысутнічалі на беларускай геакультурнай прасторы. У межах главы 2 таксама прааналізаваны шляхі пранікнення ідэй неатамізму, вызначаны тып неатамістычных ідэй, прысутных ў творчай спадчыне беларускіх аўтараў. Глава 3 разглядае агульныя рысы і адрозненні рэцэпцыі праграмных установак неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы. Агульны памер дысертацыі складае 116 старонак. Колькасць выкарыстаных крыніц – 215, улічваючы 14 публікацый аўтара.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Першая глава** “**АНАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД ЛІТАРАТУРЫ**” прысвечана даследаванню гістарыяграфіі праблемы, мае задачамі сістэматызацыю і аналіз асноўных крыніц, якія выкарыстоўваліся аўтарам падчас падрыхтоўкі навуковай працы. Адзначаецца, што тэма асэнсавання ідэй неатамізму беларускімі мысліцелямі не асвятляецца як у айчыннай, так і ў замежнай літаратуры.

Метадалогія даследавання будуецца на падставе сістэмнага аналізу, кантэнт-аналізу, кампаратывісцкага падыходу, гісторыка-філасофскага метаду.

**Першая група крыніц** прадстаўлена творчай спадчынай Фамы Аквінскага і яго заходнееўрапейскіх паслядоўнікаў. Асаблівая ўвага надаецца прадстаўнікам неатамізму, якія адаптавалі тамістычныя ідэі да светапогляду чалавека XX ст. Апошняя тэндэнцыя яскрава маркіравана ў працах Э. Жыльсона, Ж. Марытэна, С. Свяжавскага, К. Вайтылы, М. Кромпеца, А. Ш. Пэгі і інш.

**Другая група крыніц** прадстаўлена інтэлектуальнай спадчынай беларускіх рэлігійных дзеячаў каталіцкага напрамку: Ф. Абрантовіча, І. Бобіча, Л. Гарошкі, Т. Падзявы, Б. Пачопкі, Я. Рэшаця, Ч. Сіповіча, А. Станкевіча, Я. Тарасевіча. Аналіз дадзеных крыніц дазваляе вылучыць ступень рэцэпцыі асноўных канцэптаў і ідэй неатамізму ў межах праблемнага поля філасофскай думкі Беларусі.

**Трэцяя група крыніц** звязана непасрэдна з творчай спадчынай даследчыкаў неатамістычнага кірунку – працы Ч. Гломбіка, Я. Салія, Ж. Бафрэ, М. дэ Гандылака і інш. Імі тэматызавалася асноўнае праблемнае поле неатамістычнай філасофіі, рэканструяваліся адметныя кірункі развіцця.

Ідэі неатамізму сталі аб’ектам гісторыка-філасофскага аналізу даследчыкаў савецкай школы, якія стаялі на супрацьлеглых тамізму ідэалагічных пазіцыях. Гэта працы Ф. Г. Аўсіенкі, В. І. Гараджы, М. В. Жалнова, Н. Д. Караткова, Ю. К. Субоціна і інш.

Напрыканцы XX ст. на постсавецкай прасторы з’явіліся навуковыя даследаванні, прысвечаныя праблематыцы асэнсавання анталагічнага і гнасеалагічнага аспектаў творчай спадчыны Фамы Аквінскага і неатамістаў: працы К. В. Кір’янава, А. Баўмэйстэра.

**Чацвёртая група крыніц** прысвечана даследаванню гісторыі развіцця беларускай рэлігійна-філасофскай думкі. Адзначаецца недахоп прац, мэтай якіх з’яўляецца аналіз асноўных філасофскіх тэндэнцый, што мелі месца ў беларускай традыцыі каталіцкага напрамку ў XX ст. У цэнтры ўвагі беларускіх навукоўцаў савецкага перыяду знаходзілася канцэпцыя рэакцыйнай сутнасці каталіцызму. Дагэтуль адзіная праца, прысвечаная аналізу ўплываў філасофскіх традыцый на рэлігійна-філасофскую думку Беларусі – даследаванне Т. П. Кароткай “Рэлігійная філасофія Беларусі пачатку XX ст.”.

Значны ўклад у даследаванне творчай спадчыны прадстаўнікоў каталіцкай канфесіі ўнесла манаграфія У. Конана “Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі”, у праблемным полі якой рэканструявана філасофская пазіцыя згаданага грамадскага дзеяча.

Культурна-асветніцкая праца беларускіх каталіцкіх святароў асэнсоўваецца ў даследаванні І.І. Трацяка на атрыманне навуковай ступені кандыдата культуралогіі "Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак XX ст. – 1939 г.)", актуальнай для дадзенага даследавання з'яўляецца выснова аўтара аб фундаванасці творчасці беларускіх мысліцеляў ідэямі Фамы Аквінскага.

**Пятая група крыніц** прадстаўлена даследаваннямі, прысвечанымі гістарычным рэаліям развіцця беларускага касцёла, якія аказалі ўплыў на фарміраванне асаблівасцяў беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага напрамку. Дадзеная тэма асвятлялася ў сумеснай працы айчынных даследчыкаў У. Завальнюка, В. Грыгор'евай, У. Навіцкага, А. Філатавай "Канфесіі на Беларусі" (к. XVIII–XXст.).

Трэба адзначыць даследаванне Ю. Гарбінскага, прысвечанае рэканструкцыі гісторыі развіцця беларускага касцёла ў XX ст., а таксама работу Н. Гардзіенкі"Беларусы ў Вялікабрытаніі", якая даследуе эмігранцкую спадчыну беларусаў у гэтай краіне.

Вялікую каштоўнасць мае праца А. Станкевіча "Беларускі хрысціянскі рух", дзе апісваюцца ўмовы і працэсы станаўлення беларускага касцёла XX ст. Гістарычны дыскурс прадстаўлены ў работах Э.С. Ярмусіка "Каталіцкі касцёл у 1945-1990 гг." і "Каталіцкі касцёл на Беларусі ў гады другой сусветнай вайны".

Пытанне сацыякультурнай ідэнтыфікацыі беларускага каталіцкага духавенства разглядалася ў работах М. Мароз і І. І. Трацяка. Праблема паланізацыі беларускага касцёла прадстаўлена ў даследаваннях А. М. Вабішчэвіча. Станоўча адзначана дзейнасць Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў даследаваннях Э. А. Мазько.

Літаратура па тэме рэцэпцыі ідэй неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі адсутнічае. Праблема даследавання вынікае з адсутнасці фундаментальных навуковых распрацовак па дадзенай тэме.

**Другая глава "МЕСЦА ІДЭЙ НЕАТАМІЗМУ Ў ФІЛАСОФІІ БЕЛАРУСІ XX СТ."** складаецца з двух раздзелаў, у якіх вылучаюцца асноўныя крыніцы і шляхі пранікнення філасофскіх ідэй неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку, акрэсліваюцца філасофскія праблемы, актуальныя для беларускай геакультурнай прасторы, тэматызуецца яе праблемнае поле, фіксуецца прыналежнасць ідэй каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі да пэўнага варыянту неатамізму, рэканструюецца самаідэнтыфікацыя рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага кірунку ў адносінах да тагачасных філасофскіх сістэм.

**Раздзел 2.1 "Шляхі пранікнення ідэй неатамізму ў каталіцкую думку Беларусі"** даследуе элементы механізма пранікнення ідэй неатамізму ў

беларускую філасофскую думку. У даследаванні прыведзены сведчанні аб існаванні дзвюх крыніц – афіцыйнай, прадстаўленай папскімі энцыклікамі, і неафіцыйнай – праз творчасць знакамітых прадстаўнікоў неатамістычнай філасофіі.

Вылучаюцца некалькі шляхоў пранікнення ідэй неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку. Існавалі каталіцкія сродкі масавай інфармацыі. Асветніцкай працай, у тым ліку і ў філасофскім кірунку, займалася таварыства "Рунь" ("Жыццё"). Праграмныя ўстаноўкі неатамістычнай філасофіі выкладаліся ў асноўных універсітэцкіх цэнтрах неатамізму, дзе займаліся навуковай дзейнасцю прадстаўнікі Беларусі (Ф. Абрантовіч, Я. Тарасевіч). На падставе канцэптуальнай матрыцы неатамізму пісаліся навукова-папулярныя працы "Бог", "Чалавек", "Касцёл і навука" Ф. Абрантовіча, "Зло і лякарства на яго", "Беларусы ў святле праўды" Я. Тарасевіча, "Навука і рэлігія" Л. Гарошкі, "Бог" Ч. Сіповіча і інш. Філасофская спадчына Фамы Аквінскага стала прадметам навуковых даследаванняў Ф. Абрантовіча, Я. Тарасевіча, А. Станкевіча, таксама часткова ідэі Фамы Аквінскага папулярызаваліся праз мастацкую літаратуру (творчасць К. Сваяка, Т. Падзявы).

**Раздзел 2.2 "Спецыфіка развіцця каталіцкага кірунку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі XX ст."** мае мэтай тэматызацыю асноўных філасофскіх напрамкаў і акрэсленне інтэлектуальных тэндэнцый, якія мелі месца на той перыяд у філасофскай традыцыі Беларусі.

Асноватворнымі прынцыпамі беларускай культуры былі поліканфесіянальнасць і поліэтнічнасць. Дадзеная тэндэнцыя ўвасобілася і ў філасофскай думцы. На пачатку XX ст. рэлігійна-філасофская думка на абшарах Беларусі мае моцны ўплыў. У яе межах вылучаюцца праваслаўны і каталіцкі кірункі. У каталіцкім назіраецца канкурэнцыя ідэй неатамізму і неааўгусцініянства. Лёс праваслаўнай і каталіцкай рэлігійна-філасофскіх плыняў, якія на пачатку XX ст. знаходзіліся ў падобных гістарычных абставінах, надалей адрозніваўся. Праваслаўны кірунак відавочна пацярпеў ад палітыкі "ваяўнічага атэізму", каталіцкі на заходніх абшарах Беларусі працягваў развівацца. Гэтая тэрыторыя ўваходзіла ў склад Рэспублікі Польшча, адной з ідэалагічных дамінантаў дзяржаўнай палітыкі якой быў каталіцызм.

Змястоўна беларускі неатамізм ўяўляе сабой памежную версію, якая спалучала рысы экзістэнцыяльнага і арыстоцелеўскага тыпаў неатамізму. Беларускія аўтары супрацьпастаўлялі сваю творчасць філасофіі марксізму, якую разглядалі як рэлігію матэрыялістычнага кшталту, крытыцы падвяргаліся прадстаўнікі атэістычнага экзістэнцыялізму. Назіраецца пазітыўнае стаўленне да іншых напрамкаў рэлігійнай філасофіі – тэйярдызму, бергсаніянства і хрысціянскай версіі экзістэнцыялізму.

Вынікі, атрыманыя ў другой главе дысертацыйнага даследавання, дазваляюць казаць аб тым, што на беларускай геакультурнай прасторы XX ст. паспяхова праходзілі працэсы рэцэпцыі ідэй неатамізму, якія былі натуральнай з'явай, характэрнай для інтэлектуальнай сітуацыі рэлігійнай філасофіі каталіцкай Еўропы таго часу. Нявырашанасць нацыянальнага пытання наклалася на пошук ідэй, якія б маглі дапамагчы каталіцызму адаптавацца да тых гістарычных абставін і інтэлектуальных тэндэнцый, што мелі месца ў краіне. У выніку неатамізм стаў светапоглядным падмуркам, на базе якога ўжо шла распрацоўка іншых актуальных для беларусаў пытанняў.

**Трэцяя глава даследавання "ПРАБЛЕМНАЕ ПОЛЕ НЕАТАМІЗМУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ТРАДЫЦЫІ"** прысвечана непасрэдна вылучэнню і аналізу асноўных ідэй неатамізму, якія выкарыстоўваліся беларускімі аўтарамі. Яе цэнтральная мэта – рэканструкцыя агульнай філасофскай мадэлі, уласцівай творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў, вылучэнне спецыфікі ідэй, якія былі пакладзены ў падмурак дадзенай філасофскай мадэлі, устанаўленне сувязі паміж пзаначанымі ідэямі і асноўнымі канцэптамі, праграмнымі ўстаноўкамі філасофіі неатамізму.

**Раздзел 3.1 "Метафізіка быцця і пазнання"** аналізуе мадэль універсуму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы каталіцкага напрамку, якая фарміруецца ў межах дуалістычнага светапогляду, уласцівага традыцыі ідэалізму. Прасочваецца тэндэнцыя атаясамлення Абсалюта-творцы і чалавека-стварэння шляхам аналогіі – прыёма, уласцівага агулам для неатамістычнай традыцыі. Свет падзяляецца на звышнатуральную рэчаіснасць Абсалюта, які ёсць чысты акт самаіснавання, і звычайную рэчаіснасць, асноўнымі складнікамі якой ёсць матэрыя і ідэя.

З анталагічнага дуалізму бярэ свае карані тэорыя пазнання, у межах якой беларускія аўтары сцвярджаюць, што працэс пазнання ажыццяўляецца на двух узроўнях: першы – гэта пачуццёвая рэчаіснасць, дзе працэс фарміравання ведаў праходзіць на падставе факталагічнага матэрыялу шляхам яго афармлення розумам і пачуццямі; другі – звышнатуральны, які датычыцца сферы дзеяння ісцін Адкрыцця. Беларускія аўтары сцвярджаюць існаванне аб'ектыўнай рэчаіснасці, але згодна іх уяўленням яна ўключае ў сябе і звышматэрыяльны аспект. Погляды беларускіх аўтараў на існаванне ідэй у трох аспектах (розум Абсалюту, рэчы матэрыяльнага свету і агульныя паняцці) сведчаць аб прыналежнасці да плыні ўмеранага рэалізму.

Рэфлексія аўтараў у анталагічным аспекце будуецца на падмурку ідэй esse subsistens Абсалюта, у гнасеалагічным аспекце на падзяленні анталагічных і гнасеалагічных ісцін, ўпэўненасці ў існаванні прынцыпу гармоніі паміж ісцінамі веры і розуму, выкарыстанні рацыянальных доказаў існавання

Абсалюту і інш. Трэба адзначыць і спецыфічнасць успрыняцця ідэй неатамізму ў гнасеалагічным і анталагічным аспектах. Яна ўвасобілася ў арыгінальным успрыняцці некаторых асобных аспектаў: пытання закончанасці крэацыйнага акта, спроб сцыентызацыі рэлігійных догмаў, выкарыстання прынцыпаў “тэістычнага эвалюцыянізму”.

**Раздзел 3.2 “Канцэпцыя антрапацэнтрычнасці свету”** прысвечаны аналізу філасофскіх поглядаў беларускіх мысліцеляў на чалавека і яго месца ў Сусвеце. Рэфлексія беларускіх аўтараў прасякнута імкненнем сцвярджэння антрапацэнтрычнасці свету. Асноўная ідэя неатамізму, якая знайшла адлюстраванне ў творчасці беларускіх аўтараў – гэта ідэя аб раўназначным спалучэнні душы і цела, якія толькі разам складаюць чалавека. У некаторай ступені ў антрапалагічных поглядах беларускіх аўтараў зафіксавана схільнасць да ідэй аўгусцініянства з яго спірытуалістычнымі тэндэнцыямі і прыматам духоўнага пачатку над цялесным, а таксама да выкарыстання паняццяў, неўласцівых для заходнееўрапейскай версіі неатамізму. Звяртае ўвагу ў антрапалагічным аспекце ўжыванне ў творчасці беларускіх аўтараў нехарактэрнага для неатамістычнай традыцыі таго часу (гэта датычыцца першай паловы ХХ ст.) паняцця эвалюцыі ў адносінах да часовага цела, з адначасовым адмаўленнем магчымасці выкарыстання дадзенага канцэпту ў адносінах да душы.

**Раздзел 3.3 “Сацыяльная праблематыка”** аналізуе асноўныя грамадскія тэорыі беларускіх аўтараў. Цэнтральная тэма творчасці – заклік да будаўніцтва ідэальнага соцыўму, фундаванага хрысціянскімі каштоўнасцямі. Уласцівая рыса беларускай рэлігійна-філасофскай думкі – акцэнтуацыя на тэматыцы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, якая разам з ідэяй сакральнага грамадства з’явілася падмуркам фарміравання сацыяльных поглядаў беларускіх каталіцкіх аўтараў. Відавочны ўплыў ідэі адзінай духоўнай наддзяржаўнай і надканфесійнай прасторы Ж. Марітэна, інспіраванай каштоўнасцямі хрысціянскага зместу, тэістычная версія генезісу ўлады, якая сягае каранямі да творчай спадчыны Фамы Аквінскага. Актуальная для некаторых аўтараў была ідэя “цывілізацыі любові”, у прыватнасці, яе асэнсаванне назіраецца ў творчасці Д. Анісько. Адзначаецца шматлікасць сацыяльных тэорый, прапанаваных беларускімі аўтарамі.

Вынікі, атрыманыя ў главе 3 дысертацыйнага даследавання, дазваляюць абгрунтавана казаць пра тое, што беларуская рэлігійна-філасофская думка каталіцкага напрамку амаль цалкам (часткова толькі ў антрапалагічным аспекце) ажыццявіла рэцэпцыю асноватворных ідэй і паняццяў зместу філасофіі неатамізму. Дадзеная з’ява дае магчымасць разглядаць філасофію

неатамізму ў якасці канцэптуальнага падмурка беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага напрамку ў азначаны перыяд.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Даказана, што асноўнымі шляхамі пранікнення ідэй неатамізму на беларускую геакультурную прастору былі: сістэма адукацыі, сродкі масавай інфармацыі, мастацкая літаратура, рэлігійная літаратура, навуковыя даследаванні, дзейнасць асветніцкіх таварыстваў, гамілетыка. Сістэма адукацыі прадугледжвала міжнародны абмен, дзякуючы якому беларускія каталіцкія дзеячы мелі магчымасць наведаць знакамітыя ўніверсітэцкія цэнтры неатамізму ў Бельгіі (Лювэн), Аўстрыі (Інсбрук) і Швейцарыі (Фрыбург). Сродкі масавай інфармацыі, асабліва ў пасляваенны перыяд, былі рупарам азнаямлення з ідэямі неатамізму – большасць артыкулаў беларускіх аўтараў у часопісах “Хрысьціянская думка”, “Зьніч”, “Божым шляхам” была фундавана неатамістычнымі ідэямі. Назіраецца пранікненне неатамістычных ідэй у мастацкую літаратуру (творчасць К. Сваяка, Т. Падзявы), прасякнуты ўстаноўкамі абноўленага варыянта вучэння Фамы Аквінскага філасофскія эсэ “Касцёл і навука”, “Бог”, “Чалавек” Ф. Абрантовіча, “Беларусы ў святле праўды”, “Зло і лякарства на яго”, “Чалавек – шуканнік Бога” Я. Тарасевіча, “Бог”, “Душа” Ч. Сіповіча, “Навука і рэлігія” Л. Гарошкі. Прысутнічалі навуковыя даследаванні, прысвечаныя тамістычнай тэматыцы: дысертацыйнае даследаванне Ф. Абрантовіча параўноўвае філасофскія сістэмы Фамы Аквінскага і М. Лоскага, дысертацыйнае даследаванне Я. Тарасевіча “Пакора ў святле вучэння Св. Тамаша Аквінскага” закранае этычны аспект творчай спадчыны дадзенага філосафа. Засталіся сведчанні спробы напісання магістарскай дысертацыі па асэнсаванні творчай спадчыны Фамы Аквінскага ў сямейным аспекце Адамам Станкевічам. У якасці пачатку пранікнення ідэй неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку каталіцкага напрамку трэба назваць папскія энцыклікі, а таксама творчасць заходнееўрапейскіх аўтараў, належных да неатамістычнай традыцыі [6, 10, 11].

2. У развіцці беларускай рэлігійна-філасофскай думкі выразна прасочваюцца два напрамкі: праваслаўны і каталіцкі. Каталіцкі актыўна засвойваў праграмныя ўстаноўкі аўгусцініянства і неатамізму. Праваслаўны напрамак развіцця беларускай рэлігійна-філасофскай думкі моцна пацярпеў пасля выхаду на філасофскую арэну ідэй марксізму-ленінізму, у той час як

каталіцкі працягваў развівацца на землях Заходняй Беларусі, якія ўвайшлі ў склад Рэспублікі Польшча.

Адзначаецца, што працэс рэцэпцыі ідэй неатамізму на беларускай геакультурнай прасторы адбываўся ў напружаным дыялогу ў самім змесце каталіцкага напрамку рэлігійнай філасофіі з прадстаўнікамі неааўгусцініянства.

Ідэі неатамізму сталі асновай, на якой беларускія аўтары асэнсоўвалі ў далейшым нацыянальную праблематыку. Нявырашаная праблема будаўніцтва беларускай нацыі прымушала прадстаўнікоў беларускай рэлігійна-філасофскай думкі надаваць увагу дадзенаму аспекту, таксама прывабнай аказалася ідэя магчымасці дыялога ў межах неатамізму паміж прадстаўнікамі рэлігійнага і навуковага светапоглядаў. Ідэі неатамізму выкарыстоўваліся ў якасці падмурка, на якім беларускія аўтары будавалі канцэпцыю далейшага развіцця беларускай нацыі.

У рабоце паказана, што працэс рэцэпцыі ідэй неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы ўяўляе сабой цэласную з’яву, у яе развіцці назіраецца некалькі этапаў: ад першых спроб асэнсавання на пачатку ХХ ст. у працы Ф. Абрантовіча “Касцёл і навука” да навуковых прац, прысвечаных дадзенай праблеме (Ф. Абрантовіч, Я. Тарасевіч), выкарыстання асноўных праграмных установак неатамізму ў эсэ, артыкулах, мастацкай літаратуры. Развіццё творчасці, фундаванай неатамістычнымі ідэямі, было гвалтоўна прыпынена ў сувязі з рэпрэсіямі ў адносінах да беларускіх дзеячаў (высылка ў Харбін) і аднавілася толькі ў эміграцыйны перыяд.

Асаблівасцю рэцэпцыі ідэй неатамізму на Беларусі з’яўляецца сінтэз рыс арыстоцелеўскага і экзістэнцыяльнага тыпаў. Да першага можна аднесці запазычанне асноўных ідэй творчасці Фамы Аквінскага (вяршэнства існавання над існасцю), да экзістэнцыяльнага – выкарыстанне канцэпту “трансцэндэнтнай мэты”. Рыса пераходнасці абумоўлена адсутнасцю пераемнасці развіцця неасхаластычнай традыцыі. Адбылося своеасаблівае запазычанне адразу двух тыпаў, што адбілася на спецыфіцы зместу беларускай версіі неатамізму.

Беларускія аўтары асэнсоўвалі сваю творчасць у адносінах да такіх філасофскіх сістэм і напрамкаў, як тэйярдызм, бергсаніянства, экзістэнцыялізм і марксізм. У адносінах да экзістэнцыялізму і марксізму погляды беларускіх мысліцеляў застаюцца ў межах неатамістычнай традыцыі. Спецыфічным з’яўляецца стаўленне да ідэй П. Тэйяра де Шардэна, тут беларускія аўтары супрацьстаяць такім прадстаўнікам неатамізму як Ж. Марытэн і Э. Жыльсон, М. Кромпец, заклікаючы да пільнага вывучэння творчай спадчыны згаданага аўтара [5, 8].

3. Паказана, што метафізіка быцця беларускай рэлігійна-філасофскай думкі цалкам інспіравана неатамістычнай філасофіяй, адаптавала яе асноўныя

паняцці і палажэнні: паўсюдна выкарыстоўваецца пункт гледжання на Абсалют як акт самаіснавання, праз які потым атрымлівае існаванне астатняе быццё, дадзеным фактам таксама абумоўлена другаснасць і залежнасць створанага ў крэацыйным акце свету, іерархічная будова быцця, дзе ступень дасканаласці рэчы вымяраецца на падставе яе аддаленасці ад Абсалюту: Абсалют – чыстыя інтэлекты – чалавек – прырода, што характэрна для класічнай арыстоцелеўска-тамісцкай версіі.

Агульнай тэндэнцыяй беларускай рэлігійна-філасофскай думкі і заходнееўрапейскай традыцыі неатамізму была спроба абгрунтавання акта крэацыянізму на падставе навуковых дасягненняў таго часу, адначасова моцнай крытыцы падвяргалася канцэпцыя пераскоку ад нежывой матэрыі да жывой, якая разглядалася ў якасці ідэалагічна супрацьлеглай, назіралася выкарыстанне прынцыпаў “тэістычнага эвалюцыянізму”. Для беларускіх аўтараў некаторыя аспекты крэацыйнай праблематыкі дагэтуль працягваюць заставаліся тэмай для дыскусій. Адкрытым, напрыклад, было пытанне перманентнасці ці часовасці крэацыйнага акту, а таксама яго прычыны.

Непарыўна з анталагічнымі звязаны гнасеалагічныя погляды беларускіх аўтараў. У гнасеалагічным аспекце беларуская рэлігійна-філасофская думка каталіцкага напрамку належыць да плыні ўмеранага рэалізму, прадстаўленага ў межах гармоніі веры і розуму суаднясеннем анталагічных і гнасеалагічных праўдаў, характэрных для Фамы Аквінскага, а потым выкарыстаных у творчасці Ж. Марытэна. Трэба адзначыць татальнае распаўсюджванне і выкарыстанне ў беларускай думцы канцэпцыі гармоніі веры і розуму, якая размяжоўвае праўды веры і розуму, пакідаючы прыярытэт за першымі. Беларускія аўтары таксама, у адпаведнасці з неатамістычнымі тэндэнцыямі, не адмаўляюць існавання аб’ектыўнай рэчаіснасці і пачатку працэсу пазнання ў пачуццёвых уражаннях, але пакідаюць месца і за звышнатуральным шляхам атрымання ведаў. Беларускай думцы ўласціва распрацаваная ў тамістычным рэчышчы іерархічная класіфікацыя навук, якая часткова нагадвае канцэпцыю “ступеняў быцця” Ж. Марытэна, традыцыйны ўвогуле для тамізму тэзіс частковага супадзення сфер навукі і рэлігіі, адзінства мэт навукі і рэлігіі, назіраецца тэістычнае абгрунтаванне навуковых адкрыццяў, паўсюднае выкарыстанне рацыянальных доказаў існавання Абсалюту Фамы Аквінскага.

Маюцца і рысы, уласцівыя толькі беларускай рэлігійна-філасофскай думцы. Так, працэс пазнання – тэма актуальная і папулярная для неатамістычных аўтараў – амаль не закранаецца ў творчасці беларускіх мысліцеляў. Адзначаецца ўзмоцненая сцыентызаванасць рэлігійнай дагматыкі. Ідучы па шляху сцыентызацыі, беларускія мысліцелі дадаюць да доказаў існавання Абсалюту Фамы Аквінскага ўласны, заснаваны на тагачасных

навуковых адкрыццях, пасрэдным разуменні Бога – доказ на падставе адкрыцця энергіі, якая, на іх думку, з'яўляецца бясспрэчным доказам няслушнасці канцэпцыі пераскоку ад нежывой матэрыі да жывой, а таксама сведчаннем існавання Абсалюту. У эвалюцыі гнасеалагічных поглядаў аўтараў адбываецца пераход ад рэфлексіі, засяроджанай на агульных прынцыпах і законах, а таксама спецыфіцы пазнання, да больш утылітарнага падыходу, калі неатамістычныя погляды выкарыстоўваюцца для абгрунтавання шэрагу навуковых дасягненняў з фідэістычнага пункту погляду [2, 3, 7, 9, 12, 14].

4. У працы паказана, што адна з цэнтральных ідэй беларускай рэлігійна-філасофскай думкі – ідэя антрапацэнтрычнасці свету. Згодна з поглядамі беларускіх аўтараў, чалавек – вяршыня матэрыяльнага быцця, ён далучаецца да сферы чыстых інтэлектаў дзякуючы наяўнасці разумнай душы і адначасова з'яўляецца часткай матэрыяльнага свету дзякуючы фізічнай абалонцы. Адзначаецца, што ўласцівы беларускай рэлігійна-філасофскай думцы разгляд чалавека ў якасці "сінтэзу сусвету" – адна з асноватворных праграмных установак філасофіі неатамізму.

Паказана, што асаблівасцю беларускай рэлігійна-філасофскай думкі было толькі фрагментарнае ўспрыняцце неатамістычнай антрапалогіі, згодна з якой чалавек ёсць раўнапраўнай лучнасцю матэрыяльнага цела і духоўнай душы. Частка аўтараў (Б. Пачопка, І. Бобіч) не зацікавіліся дадзенай ідэяй, застаючыся на пазіцыі прынцыповага размежавання і супрацьпастаўлення матэрыяльнага і духоўнага пачаткаў у чалавеку, уласцівага для платонаўска-аўгусцініянскіх поглядаў. Атрымала пашырэнне палажэнне аб творчым пачатку ў чалавеку, які робіць яго падобным да Абсалюту – неабходнай рысе на шляху яго развіцця, што часткова супадае з тэорыяй культуры Ж. Марытэна.

У антрапалогіі беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў перапрацаваным выглядзе актыўна выкарыстоўваецца ўласцівая творчасці Фамы Аквінскага канцэпцыя наяўнасці ў чалавечай душы, акрамя рысаў, уласцівых чалавечай, у матэрыяльным аспекце рыс зямельнай, раслiннай і жывёльнай душы. Адначасова ў дадзеным аспекце заўважны нехарактэрны для заходнееўрапейскіх аўтараў ухіл у бок матэрыяльнага разумення: зямельную, раслінную і жывёльную рысы частка беларускіх мысліцеляў адносіць ужо да цялеснага пачатку, а не духоўнага.

Беларускія аўтары ў антрапалагічным аспекце рэлігійна-філасофскай думкі, карыстаюцца для абгрунтавання ўласнай рэфлексіі паняццем эвалюцыі і спрабуюць асэнсаваць антрапагенез менавіта з дапамогай дадзенага прынцыпу яшчэ да дазволу выкарыстання вышэйпазначанай праграмнай устаноўкі ў энцыкліцы Humani Generis [1, 9, 12, 14].

5. Сацыяльная думка мае ў якасці асновы этыку індывідуальнага існавання. Паказана, што актуальным пытаннем для беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў сацыяльным аспекце быў пошук стратэгіі развіцця беларускай дзяржаўнасці. У сувязі з гэтым вялікую папулярнасць атрымала ідэя дзяржавы, падначаленай хрысціянскім каштоўнасцям у светапоглядным плане і дэмакратычным – у палітычным.

Даказана, што распрацоўка сацыяльнага аспекту ў творчасці беларускіх аўтараў здзяйснялася на падмурку канцэптаў неатамістычнай філасофіі, выкарыстоўваючы праграмныя ўстаноўкі як арыстоцелеўска-тамісцкай, так і экзістэнцыяльнай версій. У грамадскіх поглядах беларускіх аўтараў прысутнічаюць наступныя прынцыпы вышэйпазначаных кірункаў: паўсюднае выкарыстанне катэгорыі агульнага дабра, размежаванне зместу і формы ўлады – першы мае крыніцай паходжання Абсалют, другая – грамадскае паходжанне; трыяда "Бог-бацькі-Бацькаўшчына", ідэал універсальнай дзяржавы, якая мае падставай хрысціянскія каштоўнасці не ў палітычнай, а ў маральнай сферы, тэматыка антрапацэнтрычнага крызісу, абумоўленага прыярытэтам свецкіх каштоўнасцяў, пачаткам якіх з'яўляецца Адраджэнне з уласцівым яму культам асобы.

Спецыфічнасць сацыяльнага аспекту адлюстравалася ў развіцці унійнай тэматыкі, якая пазней паўстала ў вобразе асаблівай хрысціянскай улады, якая нябачна знаходзіцца ў якасці асноватворных прынцыпаў ва ўсіх сферах грамадства. У межах беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў творах асобных аўтараў (Д. Аніська, П. Татарыновіч) зафіксаваны тэорыі разгляду беларускай прасторы як цывілізацыйнага скрыжавання паміж Усходам і Захадам (інспіравана творчасцю І. Абдзіраловіча), канцэпцыя грамадства, аб'яднанага трансцэндэнтнай катэгорыяй любові, а таксама канцэпцыя грамадства, аб'яднанага агульнымі звышканфесійнымі хрысціянскімі каштоўнасцямі, пераасэнсаваная тэорыя М. Данілеўскага [4, 13].

Усё вышэйсказанае сведчыць аб наяўнасці ў беларускай філасофскай думцы дагэтуль не акрэсленых у навуковых даследаваннях ідэй неатамізму, якія, адпавядаючы ў сваім змесце агульным заходнееўрапейскім тэндэнцыям, мелі свае яскравыя асаблівасці.

Асэнсаванне прысутнасці на беларускай геакультурнай прасторы рэлігійнай філасофіі, фундаванай у выпадку каталіцкага напрамку ідэямі неатамізму, дазваляе інакш разглядаць тыя інтэлектуальныя працэсы, якія адбываліся ў XX ст. на беларускіх абшарах, і значна ўзбагачае змест айчыннай гісторыі філасофіі.

Відавочна, што асноўныя паняцці, ідэі і праграмныя ўстаноўкі неатамізму мелі для беларускай рэлігійна-філасофскай думкі значны

эўрыстычны патэнцыял і выкарыстоўваліся ў якасці канцэптуальнай матрыцы для асэнсавання і тэматызацыі шэрагу актуальных для таго часу пытанняў. Каталіцкі напрамак беларускай рэлігійна-філасофскай думкі паспяхова здзейсніў рэцэпцыю катэгарыяльна-паняційнага апарату і асноўных ідэй неатамізму, а таму з’яўляецца неатамістычным па сваім змесце.

Адаптацыя ідэй неатамізму дакладна зафіксавана на ўзроўні рэцэпцыі, таксама ў сілу спецыфічнасці вышэйпазначаных адметных рыс мы можам казаць аб своеасаблівасці працэсаў яе запазычання на беларускай геакультурнай прасторы.

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі працы могуць быць выкарыстаны падчас далейшых даследаванняў у галінах гісторыі філасофіі, сучасных сацыягуманітарных ведаў, а менавіта: пры даследаванні станаўлення філасофскай думкі Беларусі XX ст., тэматызацыі праблемнага поля беларускай нацыянальнай філасофіі XX ст., вывучэнні палітычнай гісторыі Беларусі, праблем культурнага ўзаемадзеяння з іншымі краінамі. Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца з мэтай фарміравання ідэалагічнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь, будавання прагрэсіўных адносін з шэрагам краін Еўрапейскага Саюза. Дадзеныя вынікі могуць сутнасна ўзбагаціць курсы “Гісторыя філасофіі Беларусі”, “Гісторыі Беларусі”, “Рэлігіязнаўства”.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДАСЛЕДАВАННЯ

**Артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных ВАК у пералік выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў**

1. Пущина, А.И. (Климович, А.И.) Персоналистский принцип в традиции неотомизма / А.И. Пущина (А.И. Климович) // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Сер. А. Гуманит. науки. – 2005. – № 7. – С. 99–106.

2. Клімовіч, Г.І. Гнасеалагічны аспект творчай спадчыны айца Фабіяна Абрантовіча / Г.І. Клімовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Сер. Е. Пед. науки. – 2011. – № 15. – С. 130–133.

3. Клімовіч, Г.І. Традыцыя беларускага тамізму: анталагічны аспект / Г.І. Клімовіч // Философия и соц. науки. – 2012. – № 3/4. – С. 37–41.

4. Клімовіч, Г.І. Тэматызацыя сацыяльнага аспекта ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы / Г.І. Клімовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Сер. Е. Пед. науки. – 2012. – № 7. – С. 165–168

5. Клімовіч, Г.І. Беларускі філасофскі ландшафт першай паловы XX стагоддзя / Г.І. Клімовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Сер. Е. Пед. науки. – 2014. – № 15. – С. 75–81.

6. Клімовіч, Г.І. Вытокі і шляхі рэцэпцыі ідэй неатамізму на беларускай геакультурнай прасторы / Г.І. Клімовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Сер. Е. Педагогические науки. – 2015. – № 7. – С. 96–99.

7. Клімовіч, Г.І. Неатамістычны аспект гнасеалагічнай праблематыкі беларускай рэлігійна-філасофскай думкі XX ст. / Г.І. Клімовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – Серия Е. Педагогические науки. – 2015. – № 15. – С. 81–84.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

8. Клімовіч, Г.І. Другі Ватыканскі сабор: рэакцыя беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў / Г.І. Клімовіч // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 177–180.

9. Клімовіч, Г.І. Пытанне наяўнасці неатамісцкай традыцыі ў беларускай інтэлектуальнай думцы / Г.І. Клімовіч // Романовские чтения – 8: сборник международной научной конференции. – Могилев : УО МГУ им. А.А. Кулешова, 2012. – С. 125–126.

10. Клімовіч, Г.І. Рэцэпцыя неатамізму ў філасофскай думцы Беларусі: крыніцы і шляхі распаўсюджвання / Г.І. Клімовіч // Историко-философские исследования в регионе Восточной Европы: опыт, задачи, социокультурная значимость. – Минск : Право и экономика, 2013. – С. 77–82.

11. Клімовіч, Г.І. Праблема рэцэпцыі ідэй аўгусцінізму і неатамізму ў творчасці прадстаўнікоў каталіцкага накірунку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі XX ст. / Г.І. Клімовіч // Трэці міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі: працоўныя матэрыялы. Т. 3. – Коўна, 2014. – С. 504–508.

**Тэзісы дакладаў**

12. Клімовіч, Г.І. Тамісцкая традыцыя ў творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў / Г.І. Клімовіч // Довгирдовские чтения II: философская классика и современные проблемы социокультурного развития: материалы международной конференции, г. Минск, 11 ноября 2011 г.– Минск : “Право и экономика”, 2012. – С. 103–105.

13. Клімовіч, Г.І. Праблема асэнсавання дзяржаўнага будаўніцтва ў творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў / Г.І. Клімовіч // Довгирдовские чтения III: философская антропология и социальная философия. Материалы междунар. конф., г. Минск, 26–27 апреля 2012 г. – Минск : “Право и экономика”, 2012. – С. 406–408.

14. Клімовіч, Г.І. Ідэі неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы / Г.І. Клімовіч // Человек. Культура. Общество: материалы IX науч. Конф. Студентов, магистрантов и аспирантов фак. Филос. и соц. Наук БГУ. Минск, 18 апр. 2012 г. / редкол.: А.А. Легчилин (отв. ред.), А. С. Солодухо. – Минск : БГУ, 2013. – С. 24–25.

## РЭЗЮМЭ

**Клімовіч Ганна Ігараўна**

# РЭЦЭПЦЫЯ ІДЭЙ НЕАТАМІЗМУ Ў КАТАЛІЦКАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ ХХ СТ.

**Ключавыя словы**: неатамізм, арыстоцелеўскі тамізм, экзістэнцыяльны неатамізм, беларуская рэлігійна-філасофская думка, існасць і існаванне, ісціны Адкрыцця, ісціны розуму, теадыцэя, антрапацэнтрызм, прынцып аналогіі, рацыянальныя доказы існавання Абсалюту, аўгусцініянства, каталіцызм.

**Мэта даследавання** – вызначэнне спецыфікі рэцэпцыі ідэй неатамізму ў каталіцкай думцы Беларусі ХХ ст.

**Метады навуковага даследавання**: гісторыка-філасофскі метад, кантэнт-аналіз, сістэмны аналіз, кампаратывісцкі падыход.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**. Упершыню ў гісторыі філасофіі здзейснена комплекснае даследаванне каталіцкай думкі Беларусі ХХ ст. з мэтай вызначэння месца і ролі ідэй неатамізму ў дадзеным кірунку. Разгледжаны асноўныя аспекты развіцця беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага напрамку ў творчасці Ф. Абрантовіча, Л. Гарошкі, Ф. Падзявы, Ч. Сіповіча, А. Станкевіча, Я. Тарасевіча і інш., устаноўлена іх канцэптуальная фундаванасць ідэямі неатамізму, у навуковае абарачэнне была ўведзена творчая спадчына айчынных аўтараў.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца пры далейшых даследаваннях ў галіне гісторыі беларускай і заходнееўрапейскай філасофіі, сацыягуманітарных ведаў: пры даследаванні станаўлення філасофскай думкі Беларусі ХХ ст., праблемнага поля беларускай нацыянальнай філасофіі ХХ ст., вывучэнні палітычнай гісторыі Беларусі, праблем культурнага ўзаемадзеяння з іншымі краінамі. Могуць быць выкарыстаны для мадэрнізацыі існуючых курсаў, а таксама для распрацоўкі новых курсаў і спецкурсаў для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў вышэйшых навучальных устаноў.

**Галіна выкарыстання.** Гісторыя філасофіі, гісторыя філасофскай думкі Беларусі, канфесійная гісторыя Беларусі.

# РЕЗЮМЕ

**Климович Анна Игоревна**

## РЕЦЕПЦИЯ ИДЕЙ НЕОТОМИЗМА В КАТОЛИЧЕСКОЙ МЫСЛИ БЕЛАРУСИ XX ВЕКА

**Ключевые слова:** неотомизм, аристотелевский томизм, экзистенциальный неотомизм, белорусская религиозно-философская мысль, сущность и существование, истины Откровения, истины разума, теодицея, антропоцентризм, принцип аналогии, рациональные доказательства существования Абсолюта, августинианство, католицизм.

**Цель исследования** – определение специфики рецепции идей неотомизма в католической мысли Беларуси.

**Методы научного исследования**: историко-философский метод, контент-анализ, системный анализ, компаративистский подход.

**Научная новизна и значимость полученных результатов**. Впервые в истории философии осуществлено комплексное исследование католической мысли Беларуси XX в. с целью определения места и роли идей неотомизма в данном направлении. Рассмотрены основные аспекты развития белорусской религиозно-философской мысли католического направления в творчестве Ф. Абрантовича, Л. Гарошки, Ф. Подявы, Ч. Сиповича, А. Станкевича, Я. Тарасевича и др., установлена их концептуальная фундированность идеями неотомизма, в научный оборот введено творческое наследие отечественных авторов.

**Рекомендации по практическому использованию полученных результатов**. Результаты диссертационного исследования могут использоваться при дальнейших исследованиях в области истории белорусской и западноевропейской философии, социогуманитарного знания: при исследовании становления философской мысли Беларуси XX в., проблемного поля белорусской национальной философии XX в., изучении политической истории Беларуси, проблем культурного взаимодействия с другими странами. Могут быть использованы для модернизации существующих курсов, а также для разработки новых курсов и спецкурсов для студентов, магистрантов и аспирантов высших учебных заведений.

**Область применения.** История философии, история философской мысли Беларуси, конфессиональная история Беларуси.

## SUMMARY

**Klimovich Hanna Igorevna**

## RECEPTION OF THE NEOTHOMISM IDEAS IN THE CATHOLIC THOUGHT OF BELARUS IN THE XX$^{th}$ c.

**Key words:** Neothomism, Aristotelian Thomism, Existential Neothomism, Belarusian religious and philosophical thought, essence and existence, truths of revelation, truths of reason, theodicy, anthropocentrism, principle of analogy, rational proofs of the existence of Absolute, Augustinianism, Catholicism.

**The purpose of research** is definition the specifics of the Neothomism's ideas reception in Belarusian catholic thought.

**The methods of research** are historical and philosophical, comparative, content and systemic analysis methods.

**The scientific novelty and significance of the received results**. For the first time in the history of philosophy has carried out a comprehensive study of Belarusian religious and philosophical thought in order to determine the place and the role of the Neothomism ideas in this area. It was considered that main aspects of the evolution of Belarusian religious and philosophical thought in the works of F. Abrantovich, L. Garoshka, F. Padziava, A. Stankevich, C. Sipovich, J. Tarasevich etc, were provided their conceptual justification by the Neothomism ideas. It was entered the philosophical heritage of the Belarusian authors.

**Application recomendations.** The results can be used in order of the further scientific research in the fields of the history of Belarusian and West European Philosophy, modern humanitarian sciences, research of evolution the philosophical thought of Belarus, thematization the problem field of Belarusian national philosophy in the XX$^{th}$ c., the study of the political history of Belarus and the problems of cultural interaction with other countries. The results can be used as a material for the modernization already existing courses and creating new courses for undergraduate and graduate students.

**Sphere of implementation.** History of Philosophy**,** History of the philosophical thought of Belarus, Confessional History of Belarus.